ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
19
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 14 (1427)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
## тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### 40-ГОДДЗЮ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ

**ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прысвечаны адкрыты прагляд літаратуры «Подзвігу народа жыць у вяках», арганізаваны бібліятэкай універсітэта. Тут змешчаны кнігі, якія расказваюць пра барацьбу беларускага народа з нямецка-фашысцкімі акупантамі, пра нялёгкі шлях да Перамогі. На праглядзе прадстаўлена каля 300 экземпляраў кніг.**

**Ф. МІРУШЧАНКА.**

### НА РАСШЫРАНЫМ ПАСЯДЖЭННІ

**бюро парткома універсітэта разгледжана пытанне аб рабоце дэканата, партыйных і грамадскіх арганізацый механіка-матэматычнага факультэта па ўдасканаленню ваенна-патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання студэнцкай моладзі, абмеркавана выкананне мерапрыемстваў, прысвечаных 40-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

**На пасяджэнні намечаны таксама мерапрыемствы па паляпшэнню прафілактыкі правапарушэнняў у калектывах падраздзяленняў універсітэта.**

**З. АЛЯКСАНДРАВА.**

### ЗАПРАШАЕМ НАВЕДАЦЬ

**магазін № 19 «Метадычная кніга». Сюды паступілі тэматычныя планы выдавецтваў «Асвета» і «Народная асвета» на 1985 год. Вы можаце аформіць папярэдні заказ на неабходную літаратуру.**

**Магазін пачаў таксама прыём падпіскі на вузкаспецыяльныя выданні па плану «Педагогіка» на 1985 год.**

**Г. ЧУДЗЯНКОВА.**

### ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАЛІТЗАЛІК

**у камсамольскіх арганізацыях універсітэта, які праводзіцца напярэдадні 114-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна. Ён з'явіцца важным этапам падрыхтоўкі да грамадска-палітычнай атэстацыі, будзе садзейнічаць павышэнню ўзроўню палітычных ведаў студэнтаў, дапаможа больш паслядоўнаму выкананню асабістага комплекснага плана.**

**Для правядзення палітзаліку створаны камісіі, у якія ўваходзяць выкладчыкі грамадскіх навук, куратары, прадстаўнікі факультэцкіх партыйных арганізацый, камітэта камсамола і камсоргі.**

**А. ВІННІЧУК.**

## ● ВУЧОБА—ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА ●



ЦІШЫНЯ... Тут заўсёды цішыня асаблівая, не падобная на ўсе астатнія. Толькі адкрыеш дзверы — і яна авалодвае гэтак жа, як водар чыстага, вяснавога паветра ў сасновым бары. Там непаўторны лясны каларыт надае задорны, вясельны спеў птушак, тут — ціхае, працавітае рыпенне ручак па паперы, шоргат перагортваемых старонак. Там пяецца гімн вясне, шчасцю, тут — ведам, навуцы. Адчыняеш дзверы — і акунаешся ў гэтую ціхую, працавітую атмасферу, дзе кожны сустракаецца з нечым незнаёмым, невядомым. Вучэбна-метадычны кабінет гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў... Кожны дзень уго наведваюць больш за 100 студэнтаў, рыхтуюцца да семінараў, пішуць рэфераты, даклады. Многія ўжо ўпэўніліся, што такі кабінет — самае падыходзячае для гэтага месца: заўсёды павышаецца жаданне працаваць, ніхто табе не перашкаджае і ёсць уся неабходная літаратура. Прыходзіш, аддаеш білет чытача, атрымліваеш неабходную літаратуру — і працуй сабе на здароўе. Нездарма ж у час сесіі колькасць студэнтаў, якія тут рыхтуюцца штодня да экзаменаў, даходзіць да трохсот чалавек.

Кабінет — твой памочнік, студэнт. Заходзь, калі ласка!

**С. ПЛЫТКЕВІЧ.**

Фота аўтара.

## ● СПРАВЫ КАМСАМОЛЬСКІЯ ●

# НА ВАСТРЫНІ КЛОПАТАЎ

**НЯДАЎНА адбыўся III пленум камітэта камсамола універсітэта. На ім разгледжана пытанне «Аб рабоце камсамольскіх арганізацый факультэта радыёфізікі і электронікі і факультэта журналістыкі па выкананню рашэнняў чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС і задачах камсамольскай арганізацыі універсітэта па далейшаму ўдасканаленню ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы, якія вынікаюць з прамовы Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша К. У. Чарненкі на лютаўскім (1984 г.) Пленуме ЦК КПСС».**

ПЛЕНУМ адкрыў сакратар камітэта камсамола А. Казулін. У прэзідыуме пленума — інструктар ЦК КПБ А. П. Кандыба, сакратар парткома універсітэта М. І. Дзямчук, прарэктар А. В. Шарапа, інструктар ЦК ЛКСМБ А. Грыдзюшка, першы сакратар Маскоўскага РК ЛКСМБ г. Мінска А. Саламаха, члены бюро камітэта камсамола універсітэта.

З дакладам выступіла намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце А. Нежавец. Яна адзначыла, што чэрвеньскі (1983 г.) Пленум ЦК КПСС паставіў перад савецкім народам канкрэтныя задачы ўдасканалення ідэалагічнай работы ў сучасных умовах.

На факультэтах радыёфізікі і электронікі і журналістыкі ў апошнія гады ўзрастае паспяховасць, створаны і працуюць вучэбна-выхаваўчыя камісіі. Вынікі сесій, падрыхтоўка да іх абмяркоўваюцца на камсамольскіх сходах. Вывучэнне і прапаганда рашэнняў XXVI з'езда КПСС, Пленумаў ЦК КПСС, XIX з'езда ВЛКСМ арганізаваны на сходах у групах, на палітінфармацыях і семінарскіх занятках па грамадскіх навуках. На факультэце радыёфізікі і электронікі ўведзены адзіны палітдзень — аўторак.

Камітэт камсамола факультэта радыёфізікі і электронікі часта запрашае выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін з ІПК, якія чытаюць лекцыі па маральных і прававых праблемах, пытаннях сям'і і шлюбу і г. д. 53 студэнты факультэта займаюцца на факультэце грамадскіх прафесій.

14 студэнтаў-радыёфізікаў і толькі адзін студэнт журфака ўдзельнічаюць у калектывах мастацкай самадзейнасці універсітэта. На факультэце радыёфізікі створаны музычны клуб, ствараецца кінафотаклуб. На журфаку з гэтага года працуе танцавальны калектыў «Чабарок», функцыяніруюць хор і тэатр мініяцюр.

Камсамольскія арганізацыі факультэтаў удзельнічаюць ва Усесаюзным паходзе моладзі па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. У ходзе месячніка абаронна-масавай работы камітэт камсамола факультэта радыёфізікі і электронікі стаў ініцыятарам правядзення спаборніцтваў паміж факультэтамі па ваенізаванаму дваяборству.

Вялікую работу вядзе камітэт камсамола журфака па інтэрнацыянальнаму выхаванню моладзі (адказная Ж. Жмайлік). На факультэтах значную работу праводзяць педагагічныя і аператыўныя атрады.

Штогод факультэт журналістыкі фарміруе 2 студэнцкія будаўнічыя атрады, факультэт радыёфізікі і электронікі — 11. Студэнты журфака працуюць спецыяльнымі карэспандэнтамі газеты «Знамя юности» на студенческой стройке». На факультэце радыёфізікі і электронікі два гады запар працавалі камуністычныя СБА, факультэт рэгулярна займае прызавыя месцы ў сацыялістычным спаборніцтве СБА.

Разам з тым у рабоце камсамольскіх арганізацый факультэтаў ёсць шэраг характэрных недахопаў. На нізкім узроўні арганізавана правядзенне палітінфармацый. На абодвух факультэтах практычна бяздзейнічаюць штабы «Камсамольскага пражэктара». Не на належным узроўні вядзецца работа ў інтэрнатах: дрэнна аформлена чытальная зала ў журналістаў, сталі сістэматычнымі непарадкі на 6 і 7 паверхах, часта зрываюцца дзяжурствы. Не спраўляецца са сваімі абавязкамі старшыня студсавета Г. Ляхаў. У інтэрнаце № 3, дзе жывуць студэнты-радыёфізікі, не аформлены ленінскі пакой, няма графіка дзяжурстваў, ніводнага стэнда на паверхах. Пакоі часта знаходзяцца ў антысанітарным стане.

Камітэтам камсамола патрэбна актывізаваць сумесную работу з кафедрамі грамадскіх навук, штогод праводзіць сумесныя пасяджэнні.

Шмат недахопаў і ў арганізацыі работы ФГП. Так, А. Грышкевіч, адказная за ФГП на журфаку, наогул не правяла сёлета набору слухачоў на першы год навучання.

Няма сістэмы ў арганізацыі работы па маральна-эстэтычнаму выхаванню моладзі. Недастаткова выкарыстоўваюцца на факультэтах магчымасці музея універсітэта.

У камсамольскай арганізацыі універсітэта ў гэтым месяцы праходзіць палітзалік, у маі пройдуць злёты СБА і ўдзельнікаў Усесаюзнага паходу моладзі па месцах баявой і працоўнай славы савецкага народа. Падрыхтоўку да гэтых знамянальных падзей, адзначыла А. Нежавец, мы павінны актыўна выкарыстаць для паляпшэння ідэалагічнай і масава-палітычнай работы. Гэта наш камсамольскі абавязак.

У спрэчках па дакладу выступілі У. Максімкоў — студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі, А. Самуйлін — намеснік сакратара камітэта камсамола гістфака, А. Чарапавіцкі — сакратар камітэта камсамола журфака, І. Супрановіч — студэнтка філфака, У. Дарохін — камандзір аператыўнага камсамольскага атрада дружыннікаў універсітэта. На пленуме выступілі таксама сакратар партыйнага камітэта М. І. Дзямчук і старшыня студэнцкага прафкома А. Д. Кішкевіч.

Пленум разгледзеў некаторыя арганізацыйныя пытанні.

**В. ЮР'ЕЎ,**
**член прэс-цэнтра камітэта камсамола універсітэта.**

## ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА. ШТО ЗРОБЛЕНА?

ПАД ТАКІМ загалоўкам у газеце за 1 сакавіка гэтага года быў змешчаны крытычны артыкул нашага спецыяльнага карэспандэнта. Ён быў падрыхтаваны па выніках сумеснага рэйду партыйнага камітэта універсітэта і рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт». Матэрыял адлюстроўваў заклапочанасць членаў камісіі станам нагляднай агітацыі на ўсіх факультэтах.

Выступленне газеты не засталося незаўважаным у партыйных бюро, камітэтах камсамола і дэканатах факультэтаў. Сёння мы змяшчаем афіцыйныя рэагаванні кіраўнікоў гэтых арганізацый.

**У. І. МІКУЛОВІЧ, сакратар партбюро факультэта радыёфізікі і электронікі:**

«Факты, выкладзеныя ў газеце ў адносінах факультэта, сапраўды мелі месца.

Загадчыку кафедры фізічнай электронікі А. А. Лабудзе, партгрупоргу той жа кафедры А. А. Андрэеву ўказана на неабходнасць больш строгага кантролю за станам і своечасовым абнаўленнем нагляднай агітацыі на кафедры.

Партыйным бюро распрацаваны канкрэтныя прапановы і рэкамендацыі па абнаўленню нагляднай агітацыі. У сучасны момант такая работа праводзіцца на ўсіх кафедрах і на факультэце ў цэлым».

**В. Г. ЦІХІНЯ, дэкан юрыдычнага факультэта:**

«Дэканат юрыдычнага факультэта паведамляе, што крытычны артыкул «Кантрасты, нюансы...» і выказаныя заўвагі ў адносінах стэнда кафедры крымінальнага права разгледжаны на нарадзе дэканата. Сапраўды, на працягу 2—3 дзён на гэтым стэндзе не было назвы кафедры, выкананай з пенапластавых літар. Яны былі сарваны невядомым зламыснікам. Аднак зараз назва кафедры адноўлена. На гэта патрабавалася толькі 2—3 дні. Цяпер стэнд знаходзіцца ў здавальняючым выглядзе.

Для больш дзейснага кантролю за станам нагляднай агітацыі на факультэце ўстаноўлена трохзменнае дзяжурства студэнтаў: на стацыянары з 8 да 14 гадзін і з 14 да 19, а на вячэрнім аддзяленні з 19 да 22 гадзін 30 мінут».

**А. КАЎЗУНОВІЧ, сакратар камітэта камсамола юрыдычнага факультэта:**

«Камітэт камсамола юрыдычнага факультэта абмеркаваў крытычную карэспандэнцыю «Кантрасты, нюансы...» Факты, выкладзеныя ў адносінах насценнай газеты «Яго вялікасць другі курс» пацвердзіліся. Адказным за сектар друку Г. Сніцінай і В. Бухарынай зроблена заўвага і ўказана на неабходнасць больш сур'ёзных адносін да выпуску насценных газет і нагляднай агітацыі».

# «КАНТРАСТЫ, НЮАНСЫ...»

**А. А. КІЛБАС, сакратар партбюро механіка-матэматычнага факультэта:**

«Матэрыялы артыкула, у якім змешчана крытыка нагляднай агітацыі на механіка-матэматычным факультэце, былі абмеркаваны 15 сакавіка на нарадзе партыйнага бюро. На папярэдняй нарадзе, 1 сакавіка, дзе было заслухана пытанне аб нагляднай агітацыі на факультэце, была прынята наступная пастанова:

— указаць адказнаму за наглядную агітацыю на факультэце А. І. Азараву за недастатковую аператыўнасць у рабоце па арганізацыі нагляднай агітацыі;

— зацвердзіць камісію пры партбюро па нагляднай агітацыі пад старшынствам Ф. В. Чумакова.

На пасяджэнні партбюро 15 сакавіка былі заслуханы прапановы па пераафармленню факультэта. Партбюро абавязала камісію да 29 сакавіка выпрацаваць канкрэтны план мерапрыемстваў і да 15 красавіка пераафарміць стэнд «Супрацоўнікі факультэта — ветэраны Вялікай Айчыннай вайны».

Факультэцкая газета «Рошым любую задачу» на працягу двух тыдняў адсутнічала на стэндзе ў сувязі са зменай рэдактара газеты. Папярэдняму рэдактару, студэнтцы Л. Гаўрылавай, рашэннем камітэта камсамола аб'яўлена вымова за нядобрасумленныя адносіны да камсамольскага даручэння. Яна вызвалена ад пасады рэдактара. Новым рэдактарам выбраны студэнт А. Даражынскі. У сучасны момант выйшаў чарговы нумар газеты».

**Ю. Л. КАЗАКОЎ, сакратар партбюро гістарычнага факультэта, А. П. ІГНАЦЕНКА, член партбюро, адказны за наглядную агітацыю:**

«У адказ на заўвагі ў адрас гістарычнага факультэта, выказаныя ў артыкуле «Кантрасты, нюансы...», паведамляем, што на гістарычным факультэце ў аўдыторыі № 522 размешчана дзейнічаючая вучэбна-метадычная экспазіцыя «Гісторыя Беларусі ў дакументах і ілюстрацыях», у якой знайшлі сваё адлюстраванне асноўныя помнікі гісторыі і культуры са старажытных часоў і да нашых дзён.

З мэтай паляпшэння прапаганды помнікаў гісторыі і культуры на факультэце плануецца арганізаваць у красавіку бягучага года пастаянную выстаўку «Помнікі беларускай архітэктуры». У яе экспазіцыю будуць уключаны і асноўныя палажэнні заканадаўчых актаў БССР па пытаннях аховы помнікаў гісторыі і культуры роднага краю. Зараз на факультэце адкрываецца выстаўка, прысвечаная 40-годдзю вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».

**Т. С. ФЕШЧАНКА, сакратар партбюро геаграфічнага факультэта, Р. А. ЖМОЙДЗЯК, дэкан факультэта:**

«У артыкуле «Кантрасты, нюансы...» у адрас нагляднай агітацыі на геаграфічным факультэце канкрэтных заўваг няма. Аднак з вызначаных агульных недахопаў некаторыя ёсць і ў нас. У сучасны момант са стацыянарных стэндаў на факультэце цалкам адноўлены стэнд «Вучэбны працэс». На стэндзе «Бягучая паспяховасць» матэрыялы пастаянна дапаўняюцца і абнаўляюцца.

У сувязі з пяцідзесяцігоддзем геаграфічнага факультэта, юбілей якога будзе адзначацца ў кастрычніку гэтага года, заканчваюцца работы па афармленню кафедральных стэндаў з улікам матэрыялаў апошніх пастаноў партыі і ўрада.

На трэцім паверсе геаграфічнага факультэта вывешаны новы маляўнічы стэнд, прысвечаны 40-годдзю вызвалення савецкай Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў «Ніхто не забыты, нішто не забыта». Абноўлена дошка «Супрацоўнікі факультэта — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны».

**АД РЭДАКЦЫІ.**

Што б хацелася дадаць да гэтых адказаў. Першае, тое, што не ўсе партыйныя бюро даслалі свае водгукі ў рэдакцыю. Праігнаравалі (другога слова тут не падбярэш) крытыку з боку рэйдавай брыгады партыйнага камітэта універсітэта кіраўнікі партарганізацый філалагічнага факультэта, факультэта журналістыкі, біялагічнага і фізічнага факультэтаў. Такія адносіны да пытанняў, што датычаць сродкаў нагляднай агітацыі з боку факультэцкіх партбюро, выклікаюць, і нават не зусім лёгкае, здзіўленне. Само па сабе напрошваецца пытанне: калі партбюро «няма часу» займацца ўдасканаленнем сродкаў нагляднай агітацыі і прапаганды, то хто ж на факультэтах вырашае гэтыя задачы, з каго спытаць за недахопы?

У адрас факультэта прыкладной матэматыкі і хімічнага факультэта ў карэспандэнцыі не выказана ніякіх заўваг. Магчыма, гэта і дало падставу сакратарам партбюро гэтых факультэтаў успрыняць матэрыял, як кажуць, на ўзроўні дыфініцыі. Інакш кажучы—прынялі да ўвагі, і не болей.

Аўтар матэрыялу не ставіў сваёй мэтай рабіць аналіз стану спраў, параўноўваючы факультэты паміж сабой. Маўляў, так: у тых, пра каго напісана— блага, а ў тых, пра каго не ўспомнілі — выдатна. На жаль, выдатна нельга пакуль што паставіць нікому.

# ПРАВЕР

**Больш як 200 чалавек налічвае зводны аператыўны камсамольскі атрад дружыннікаў універсітэта. У гэтым матэрыяле нам хацелася б расказаць аб задачах, якія стаяць перад атрадам, аб формах і метадах яго работы, аб праблемах, якія паўстаюць перад камсамольцамі — членамі АКАД.**

У НАС ІСНУЮЦЬ тры асноўныя кірункі работы. Мы сочым за парадкам у мікрараёне Паўднёвы Захад, займаемся цяжкавыхоўваемымі падлеткамі, забяспечваем арганізаванасць у кафэ «Гаўдэамус».

Паглядзім, што робіцца ў кожным кірунку. У падшэфны мікрараён дзяжурныя групы АКАД выязджаюць тры разы на тыдзень: кожную сераду, пятніцу, суботу. Калі рэйд раённы—то група ў колькасці 15 чалавек, простае дзяжурства — пяці. Але як бывае на самай справе? Возьмем, напрыклад, геаграфічны факультэт. Другога, сёмага, семнаццатага сакавіка на патруляванне выходзіла толькі па тры чалавекі, а ў раённым штабе адзначалася, што групы былі з пяці чалавек. Што гэта: зноў «мёртвыя душы»? Праўда, справа іх вынаходніка — камандзіра атрада С. Місюка — перададзена для разгледжання на персанальную камісію.

Але вернемся да патрулявання. Раней яно праходзіла так: група атрымлівала інструктаж ад участковага інспектара і... пачыналася дубліраванне рэйдаў дружыннікаў. Як і дружыннікі, члены нашых атрадаў «прагульваліся» па ярка асветленых вуліцах. Дружыннікаў яшчэ суправаджаў міліцыянер, яны хадзілі з павязкамі. А вось аператыўнікі давяраліся самі сабе. Таму адбывалася наступнае: крыху

## КАФЕДРА: ЛЮДЗІ І СПРАВЫ

# ТРАДЫЦЫЯМ —

КАФЕДРА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ — адна са старэйшых кафедраў універсітэта. Яна арганізавана ў 1956 годзе на базе кафедры беларускай мовы і літаратуры, заснаванай у 1943 годзе. Выпрацаваныя ў той час традыцыі ўзаемасувязі, творчага ўплыву, сацыялістычнага спаборніцтва, дружбы кафедра беларускай літаратуры захоўвае з кафедрай беларускай мовы і сёння. Стваральнікам кафедры беларускай літаратуры і яе першым кіраўніком быў прафесар Міхаіл Рыгоравіч Ларчанка, які ўзначальваў кафедру на працягу 28 гадоў. Ён, а таксама такія вучоныя філфака, як М. І. Жыркевіч, М. А. Жыдовіч, І. В. Гутараў, Ю. С. Пшыркоў і іншыя пакінулі глыбокі след у развіцці навукі ў нашай рэспубліцы.

Іх паслядоўнікамі на кафедры сталі І. Я. Навуменка, зараз віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР; прафесары А. А. Лойка, С. Х. Александровіч, дацэнты Д. Л. Бугаёў, В. В. Казлова, К. Р. Хромчанка, М. Б. Яфімава, У. А. Наумовіч, В. П. Рагойша, І. М. Ключановіч, якія ўнеслі вялікі ўклад у распрацоўку праблем літаратуразнаўства. Вялікую ролю ў развіцці методыкі выкладання роднай мовы і літаратуры адыгралі вучоныя-метадысты М. І. Жыркевіч, К. І. Шапялевіч, Л. А. Царынкоў, В. А. Лашкевіч. Традыцыі старэйшага пакалення плённа наследуе і ўносіць свой уклад у вырашэнне актуальных праблем літаратуразнаўства маладое пакаленне выкладчыкаў кафедры—Т. І. Шамякіна, Л. К. Тарасюк, А. М. Шыловіч, В. К. Каратай, Л. А. Ламека, В. В. Каладзінскі, Л. У. Карпава.

Той факт, што калектыў на працягу дзвюх пяцігодак займае першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве сярод іншых кафедраў факультэта, гаворыць сам за сябе. Вопыт работы кафедры надзвычай вялікі. Сказаць нават аб тым, што зроблена кафедрай толькі ў апошні час, проста немагчыма. Я хачу звярнуць увагу на захаванне і развіццё традыцый, якія адыгралі значную ролю ў тым, што кафедра лідзіруе ў сацыялістычным спаборніцтве.



Адной са старэйшых традыцый кафедры з'яўляецца цесная сувязь з літаратурным музеем імя Янкі Купалы. Пастаянныя кантакты аказваюць уплыў на сумесную распрацоўку актуальных праблем сучаснага літаратуразнаўства, на эфектыўнасць выкарыстання навуковага патэнцыялу.

Традыцыяй кафедры сталі і выязныя пасяджэнні ў школах Мядзеля, Салігорска, Слоніма, на якіх абмяркоўваюцца падручнікі па гісторыі беларускай літаратуры, праводзяцца кансультацыі для сваіх былых выпускнікоў, вывучаецца іх вопыт работы, улічваюцца заўвагі і прапановы. Членамі кафедры выдадзены шэраг падручнікаў для сярэдняй школы.

Выдатнай традыцыяй кафедры з'яўляецца і тая асаблівасць, што шэраг яе членаў уваходзіць у састаў Саюза пісьменнікаў БССР. Гэта Н. С. Гілевіч, А. А. Лойка, С. Х. Александровіч, В. П. Рагойша, К. Р. Хромчанка, Л. К. Тарасюк, Т. І. Шамякіна.

Гэта сувязь уплывае як на ўдасканаленне вучэбнага працэсу, так і на развіццё навукова-даследчай і грамадскай работы. Асобна хочацца падкрэсліць традыцыю кафедры ў вывучэнні і збору вуснай народнай творчасці і ролю ў гэтай справе прафесара Н. С. Гілевіча. Дзякуючы яго стараннням і пад яго кіраўніцтвам быў выдадзены шэраг твораў, якія атрымалі высокую ацэнку крытыкаў і з'яўляюцца вялікім укладам у развіццё сучаснай фалькларыстыкі.

Кафедра беларускай літаратуры штогод прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні традыцыйнага купалаўскага злёту студэнтаў у Вязынцы, з'яўляецца ініцыятарам і арганізатарам шматлікіх літаратурных вечароў, прысвечаных жыццю і дзейнасці беларускіх пісьменнікаў і пісьменнікаў народаў СССР, арганізуе сустрэчы з замежнымі пісьменнікамі, якія наведваюць Мінск. Адной з апошніх была сустрэча з Героем Сацыялістычнай Працы, народным пісьменнікам БССР Іванам Шамякіным.

Галоўная прычына поспеху дзейнасці кафедры — у яе людзях, у дружным калектыве, у добразычлівым мікраклімаце...

* * *

**Вольга Васільеўна КАЗЛОВА, загадчыца кафедры, заслужаны работнік вышэйшай школы.**

Яна з тых людзей, якіх называюць душа-чалавек, а студэнты дабаўляюць яшчэ і слова «свой». Так сказалі пра гэту жанчыну яе калегі па працы. І сама я ўпэўнілася ў гэтым у час нашай першай сустрэчы.

У той дзень было пасяджэнне кафедры. На ім гаварылася аб тым, што ужо зроблена і што патрэбна зрабіць. Я бачыла, як уважліва яна слухала кожнага выступаючага, і кожны ёй гаварыў і жадаў гаварыць. Таму што яна ўмее слухаць.

Вельмі добра сказала аб Вользе Васільеўне выкладчыца Т. І. Шамякіна:

— Ведаеце, ёсць людзі, да

# СВЯТА ПРАЦЫ



КАЛІ Ў ГЭТУЮ прыгожую веснавую пару прайсці праз вестыбюль галоўнага корпуса універсітэта недзе пасля дзвюх гадзін дня, нельга не заўважыць вялікі натоўп студэнтаў у рознакаляровых вопратках, будатрадаўскіх спяцоўках. Дзяўчаты мільгаюць хусцінкамі, хлопцы збіраюцца гуртам і нешта абмяркоўваюць. Але праходзіць некалькі хвілін, і вестыбюль пусцее — студэнты накіроўваюцца на суботнік, на свята працы...

**НА ЗДЫМКАХ: зменны майстар 5-га ўчастка Мінскага метрапалітэна А. Шульга вязе чарговую групу студэнтаў (на гэты раз філолагаў) на месца работы; на суботніку — праца ўдарная.**

**Фота У. БЕРАЖКОВА.**





## НА ШЛЯХУ — «СПАРТАК» І «ГАРЫЗОНТ»

СТАРТАВАЎ кубак БССР па баскетболу. У ім прымаюць удзел усе мацнейшыя калектывы рэспублікі, у тым ліку і жаночая каманда нашага універсітэта. Прэтэндэнтамі на выхад у фінал называюць «Гарызонт», ІФК (Мінск), «Сож» (Гомель), «Спартак» (Віцебск) і БДУ.

Спачатку калектывы праводзяць гульні па алімпійскай сістэме — прайграўшы выбывае. Прычым два матчы праходзяць на полі саперніка, а два — «дома». А затым па дзве лепшыя каманды ад дзвюх зон разам са зборнай школьніц рэспублікі складуць фінальную групу.

Першыя свае матчы мы правялі ў Брэсце з камандай мясцовага педінстытута. Нашы дзяўчаты лёгка дабіліся перамог — 84:54, 82:49. 21 красавіка ў семнаццаць гадзін і 22-га у адзінаццаць гадзін у спартыўнай зале галоўнага корпуса адбудуцца паўторныя гульні. Практычна мы забяспечылі сабе выхад у наступны круг, дзе сустрэнемся з віцебскім «Спартаком», які ў Мінску двойчы «разграміў» БПІ. «Спартак» — сярэбраны прызёр мінулага чэмпіяната БССР, але мы раней не раз выйгравалі ў яго, таму спадзяёмся на поспех і цяпер. Пераможца гэтага матча выйдзе ў фінальную групу. Другой камандай ад нашай зоны хутчэй за ўсё будзе «Гарызонт», за якую выступаюць баскетбалісткі асноўнага саставу — удзельніцы чэмпіяната СССР, бронзавыя прызёры VIII летняй Спартакіяды народаў СССР.

Хочацца спадзявацца, што аматары спорту прыйдуць на нашы матчы і мы адчуем іх гарачую падтрымку.

**В. ШХІНЬЯН,**
**трэнер каманды.**

### ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ

## «СПАРТЫЎНАЕ ПЯРО»

**ПАДВЕДЗЕНЫ вынікі конкурсу насценных спартыўных газет факультэтаў, якія праводзілі рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» і спартыўны клуб.**

**Першае месца прысуджана насценнай газеце «Віраж», органу спортбюро факультэта журналістыкі (рэдактар Л. Хракоўскі). Другое месца заняла насценная газета «Буравеснік» — орган спортбюро факультэта радыёфізікі і электронікі (рэдактар В. Мілютка). Трэці прыз прысуджаны фотагазетам геаграфічнага факультэта (рэдактар А. Вялікаселец).**

**Журы віншуе лаўрэатаў і жадае ім далейшых творчых поспехаў!**

## ЗАПАВЕТНЫЯ РУБЯЖЫ

ДА СТАРТУ застаюцца лічаныя секунды. Спартсмены настройваюцца на барацьбу, яшчэ і яшчэ раз у думках прабягаючы кожны метр знаёмай да драбніц дыстанцыі кросу: «Тут патрэбна набраць хуткасць, на гэтым участку можна расслабіцца, а потым...»

Стрэл стартавага пісталета абарваў роздумы. Цяпер — толькі наперад. У лідэры адразу ж выходзяць два спартсмены — сябры па вучобе і сапернікі на дыстанцыі Віктар Касцяйкоў і Пётр Курышка.

...Залаты медаль за веды, атрыманы па выніках дзесяцігодкі, адкрываў перад Віктарам магчымасці шырокага выбару. Ён выбраў хімію. Прафіліруючы экзамен здаў на выдатна і стаў студэнтам хімфака. Тут ён пазнаёміўся з Герам Маскаленкам, першаразраднікам - лёгкаатлетам. Хлопцы разгаварыліся, знайшліся агульныя інтарэсы, і Гера прапанаваў Віктару сур'ёзна заняцца спортам.

Восенню Віктар прыйшоў у лёгкаатлетычную секцыю. Пабываў на адных занятках, на другіх, але хутка, як гэта бывае з першакурснікамі, вучоба захапіла ўсяго яго. Цяпер толькі зрэдку «наведваў» ён секцыю, хоць трэнер Віктар Якаўлевіч Шпігаў даў яму зразумець, што здольнасці лёгкаатлета ў яго ёсць.

Прайшоў яшчэ год. Віктар жыў у інтэрнаце, перад вокнамі якога быў стадыён. Вабіла да сябе бегавая дарожка, і неадольнае жаданне трэніравацца вярнула Віктара ў секцыю. Паспяваць даводзілася зараз усюды: і за студэнцкай партай (Віця вучыцца толькі на выдатна), і на трэніроўках. А яшчэ хочацца паспець схадзіць у кіно, пачытаць цікавую кнігу, пахвалявацца ля тэлевізара за мінскае «Дынама».

У мінулым годзе на зімовым першынстве універсітэта Касцяйкоў заняў другое месца на дыстанцыі 1000 метраў, а праз паўгадзіны выйшаў на старт эстафеты. Для яго наогул не існуе слоў «не магу», «стаміўся»... Ён заўсёды там, дзе цяжэй. Вось і ў эстафеце самы цяжкі этап — першы. Значыць, бегчы яго будзе Віктар. Чаму? Таму што надзейны ён, чалавек і спартсмен. Вось і ставіць яго каманда наперад.

Калі Віктар прыехаў на практыку ў школу-інтэрнат імя Ахрэмчыка, вучні хадзілі за ім гуртам, шчыра дзяліліся з ім свае радасці і смутак. Не выпадкова Касцяйкоў адчувае сваё прызванне да педагогікі, звязвае з ёю будучыню. І яшчэ ёсць у Віктара запаветныя рубяжы ў спорце, але іх ён, засаромеўшыся, не стаў называць. За яго сказалі сябры: «Нарматыў майстра спорту. Віктар абавязкова выканае яго». Кандыдатам у майстры спорту ён ужо стаў.

**А. ДАНІЛЬЧАНКА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

### ПАТРАБУЕ ВЫРАШЭННЯ

## СУМНА...

ТАКУЮ «карусель закруцілі» шашысты, што да апошняга тура было незразумела, хто ж стане прызёрам. Усе каманды, акрамя журфака, прэтэндавалі на ганаровае месца. І вось падведзены вынікі, пакладзена на паліцу справаздача, і разумееш, што першынство было сумным. Каманд удзельнічала ўсяго шэсць. Здзіўляешся, няўжо няма шашыстаў на іншых факультэтах і студэнты не гуляюць паміж сабой у цудоўную рускую гульню? Ёсць, але палажэнне аб правядзенні спартакіяды універсітэта не стымулюе да актыўнага ўдзелу ўсіх. Не, на спартсменаў не навальваюцца суровыя абмежаванні, зусім наадварот. У палажэнні гаворыцца: «Агульнае месца факультэта ў спартакіядзе вызначаецца колькасцю набраных ачкоў у заліковых відах і падзеленай на каэфіцыент». Навошта тады біяфаку, геафаку, юрфаку, філфаку ўдзельнічаць у турніры па шашках, калі яны не зоймуць тут высокага месца.

Зразумела; факультэтам становіцца некалькі лягчэй — не трэба выстаўляць каманды на ўсе віды. Але не думаю, што гэты пункт у палажэнні выйгрышны. У што ператвараюцца універсітэцкія спаборніцтвы цяпер? Спаборнічаюць усяго некалькі каманд. І таму становіцца сумна за шашкі, у якія можа гуляць кожны.

Тое ж самае можна сказаць і аб вольнай барацьбе. У спаборніцтвах прыняло ўдзел пяць факультэтаў. Прыводзім турнірную табліцу (ачкі, якія стаяць побач з факультэтамі, ідуць у залік спартакіяды):

| | шашкі | в.-барацьба |
|---|---|---|
| фізфак | 180 | 183 |
| ФПМ | 150 | — |
| радыёфізікі і электронікі | 120 | — |
| хімфак | 90 | 133 |
| мехмат | 80 | — |
| журфак | 70 | — |
| юрфак | — | 197 |
| геафак | — | 108 |
| гістфак | — | 45 |

Кафедры фізвыхавання і спорту і спартыўнаму клубу варта падумаць над пастаўленым пытаннем пры распрацоўцы новага палажэння аб правядзенні спартакіяды.

**І. УЛАДЗІМІРАЎ,**
**наш кар.**



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

19 красавіка 1984 г.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 10188 Зак. 689

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ